Каб антыбіётыкі дапамагалі

СТАР. 5

Нумар дзіцячага даверу

СТАР. 6

Трэш-арт ірве шаблоны мыслення

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 10 (28120) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЫЯРЫТЭТЫ Ў РАЗВІЦЦІ ГАРАДОЎ-СПАДАРОЖНІКАЎ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў схемы комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі абласцей і генеральныя планы горада–спадарожніка Брэста — Жабінкі, горада–спадарожніка Гродна — Скідзеля, а таксама гарадоў–спадарожнікаў Мінска — Дзяржынска, Заслаўя, Лагойска, Рудзенска, Смалявіч і Фаніпаля. Адпаведны ўказ №13 Прэзідэнт падпісаў 18 студзеня, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У схемах улічаны асаблівасці кожнай вобласці, закладзеныя ў аснову распрацаваных рацыянальных мадэлей іх тэрытарыяльнай арганізацыі з устанаўленнем асноўных планіровачных восей і цэнтраў рассялення насельніцтва, што фарміруюць унутраную структуру — унутрыабласныя рэгіёны. Вызначаны таксама прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця асобных тэрыторый, інжынерна-тэхнічнай і транспартнай інфраструктуры, прадугледжаны стварэнне аптымальнай сістэмы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый рэспубліканскага і мясцовага значэння і развіццё турызму.

Як растлумачылі ў прэс-службе, рэалізацыя генеральных планаў развіцця гарадоў-спадарожнікаў будзе садзейнічаць узаемаўвязанаму развіццю гарадоў-цэнтраў з выкарыстаннем сацыяльнай інфраструктуры гарадоў-спадарожнікаў для паляпшэння абслугоўвання сельскага насельніцтва, паляпшэнню інвестыцыйнага клімату сталіцы і абласных цэнтраў за кошт пашырэння выбару інвестыцыйных пляцовак, забяспечаных працоўнымі рэсурсамі, транспартнай і інжынернай інфраструктурай.

ПАТРЭБНЫ НОВЫ ІМПУЛЬС

Беларусі і Расіі трэба будзе правесці вялікую работу па аднаўленні ўзаемнага тавараабароту. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«У новым годзе нам трэба будзе абнавіць усе задумкі. На жаль, не ўсё атрымалася ў 2015 годзе так, як мы меркавалі. Мяркую, нас чакае вялікая праца па аднаўленні ўзаемнага тавараабароту, таму што адбылося істотнае яго запаволенне», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым кіраўнік беларускага ўрада канстатаваў, што эканомікі дзвюх краін адаптуюцца да новых знешнеэканамічных умоў. «Думаю, мы адновім праграмы знешнеэканамічнага супрацоўніцтва, якія не спыняліся, але рэалізоўваліся не ў тым тэмпе, як гэта трэба было», — сказаў ён.

Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што неабходна актыўна заняцца тым, каб эканамічныя суб'екты дзвюх краін атрымалі новы імпульс да ўзаемнага супрацоўніцтва.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што згодна з дасягнутай дамоўленасцю, пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы плануецца правесці ў I квартале 2016 года ў Мінску. «Мы пагаворым, каб парадак дня меў максімальнае напаўненне, каб гэта вялікае мерапрыемства паслужыла штуршком для актывізацыі нашага супрацоўніцтва», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік беларускага ўрада канстатаваў, што ў бліжэйшы час збіраецца наведаць шэраг рэгіёнаў Расіі. У прыватнасці, запланавана паездка ў Санкт-Пецярбург. «З Татарстанам таксама прагаворваем сустрэчы», — дадаў Андрэй Кабякоў.

ЭКЗАМЕН НА СТАЛАСЦЬ

Новы склад Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук на наступныя тры гады зацверджаны на яго агульным сходзе. У выніку адкрытага галасавання старшынёй зноў выбралі Андрэя Іванца — загадчыка лабараторыі Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі, кандыдата хімічных навук.

На сённяшні дзень у арганізацыях НАН Беларусі працуюць каля 2 200 маладых спецыялістаў. Штогод падраздзяленні акадэміі папаўняюць ад 300 да 350 маладых людзей. На думку старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, акадэміка Уладзіміра Гусакова, Савет маладых вучоных праявіў сваю сталасць: «Гэта сур'ёзная арганізацыя, якая спраўляецца з адказнымі і важнымі даручэннямі. Мы ўскладаем на моладзь вялікія надзеі».

Сярод знакавых мерапрыемстваў, праведзеных Саветам маладых вучоных у 2015 годзе, — першы Еўразійскі форум маладых навукоўцаў YES Forum, які сабраў 500 удзельнікаў з 12 краін свету; міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Моладзь у навуцы». Актыўным быў удзел у маладзёжным конкурсе «100 ідэй для Беларусі» і студэнцкім турніры прыродазнаўча-навуковых дысцыплін. З мэтай прыцягнення школьнікаў да навуковай працы з канца кастрычніка 2015 года Саветам маладых навукоўцаў сумесна з Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі арганізавана праца «Школы юных даследчыкаў».

Вялікія планы ў моладзі і на 2016 год. З 17 па 22 студзеня дэлегацыя Савета маладых вучоных знаходзіцца ў Сінгапуры, дзе прымае ўдзел у «Глабальным саміце маладых навукоўцаў». У чэрвені на базе акадэміі пройдзе міжнародная школа маладых навукоўцаў-біятэхнолагаў з удзелам вядучых прафесараў Еўрапейскай біятэхналагічнай асацыяцыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Вадохрышча

ГАЙДА Ў ІЯРДАНСКУЮ КУПЕЛЬ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праваслаўныя жыхары Мінска адзначылі свята Бога'яўлення масавым акуканнем у асвячоную ваду азёр, сажалак і царкоўных купеляў. Гэты здымак быў зроблены на вадасховішчы Вяча Мінскага раёна.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ, старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД:

«На першым месцы для СНД, вядома, у парадку дня стаіць пытанне аб сумесных намаганнях па супрацьдзеянні тэрарыстычным пагрозам. Пагроза міжнароднага тэрарызму, на жаль, захоўваецца, і яго праявы ў наяўнасці.

Мы бачым, што кожны дзень у краінах Блізкага Усходу, ды і ў Еўропе ажыццяўляюцца тэрарыстычныя акты, якія забіраюць чалавечыя жыцці. Дзейнасць краін Садружнасці па супрацьдзеянні тэрарыстычным пагрозам у гэтай сувязі застаецца асабліва актуальнай. Упэўнены, што мы зможам распрацаваць узмоцненыя сумесныя меры».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	- 4°
Віцебск	- 8°
Гомель	- 7°
Гродна	- 6°
Магілёў	- 8°
Мінск	- 7°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2016 г.

Долар ЗША	20412,00	▼
Еўра	22181,00	▼
Рас. руб.	259,83	▲
Укр. грыўня	826,40	▼

ЧАС АГУЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

«Заканадаўчыя механізмы і парламенцкая дыпламатыя развіваюцца ў кантэксце жыццёвых рэалій і выклікаў, якія стаяць перад нашай краінай», — падкрэсліў у інтэрв'ю «Звяздзе» Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА

— Уладзімір Паўлавіч, Палата прадстаўнікоў завяршыла мінулы год і пачала новы на мажорнай ноце. Маю на ўвазе актыўны ўдзел дэпутатаў у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Якія пачуцці пакінула ў вашым сэрцы сустрэча з выхаванцамі Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната?

— Пачуцці самыя добрыя, светлыя, як да дзяцей, што трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, так і да іх выхавацеляў. Вельмі важна, каб дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця не толькі мелі магчымасці для сталення і наступнай адаптацыі да жыцця ў грамадстве, але і каб яны не гублялі веру ў дабро і нароўні з дзецьмі, якія растуць у роднай сям'і, адчувалі да сябе шчырую ўвагу і клопат дарослых. Дзяржава нават у складаным эканамічнай сітуацыі няўхільна рэалізуе канстытуцыйнае права кожнага дзіцяці мець шчаслівае дзяцінства. Як падкрэсліў нядаўна Прэзідэнт, у нашай краіне ніколі не будуць эканоміць на маці і дзецях. Дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» яшчэ раз пераканаўча засведчыла, што клопат пра падрастаючае пакаленне знаходзіцца

ў цэнтры сацыяльнай і ўсёй дзяржаўнай палітыкі.

— На ваш погляд, якім быў 2015 год у парламенцкім вымярэнні?

— Ён быў змястоўна насычаным, даволі працаёмкім і плённым, як у заканадаўчым, так і ў міжнародным плане. Праведзены тры сесіі Палаты прадстаўнікоў, у тым ліку адна нечарговая, шэраг выязных і сумесных пасяджэнняў пастаянных камісій, міжнародных сустрэч і візітаў. Дэпутаты актыўна ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, прымеркаваных да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і ў прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, вялікую ўвагу ўдзялілі рабоце ў сваіх выбарчых округах, рэгулярна сустракаліся з выбаршчыкамі, аказвалі ім магчымую дапамогу ў жыццёвых праблемах і клопатах. За ўсім гэтым, пагадзіцеся, вялікі пласт разнастайнай напружанай працы.

— Што вы лічыце найбольшым набыткам мінулага года ў заканатворчай дзейнасці парламента?

— Істотна абнавілася рэгуляторнае поле эканамічных адносін і нацыянальнай бяспекі, заканадаўства па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, экалогіі і прыродакарыстання. Самыя буйныя, сістэмныя рашэнні — законы аб барацьбе з карупцыяй, аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве і аб прамысловай бяспецы, Лясны кодэкс, а таксама адобраны ў першым чытанні праект Кодэкса аб культуры. Значна пашырылася міжнародная дагаворна-прававая база, у якой вядзелю блок законаў аб ратыфікацыі дагавораў і пагадненняў у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

— Змены якога характару, калі не дэталізаваць, уносяцца ў заканадаўства?

— Мы імкнёмся да таго, каб законы, якія прымаюцца, былі рэалістычнымі, канкрэтнымі і максімальна карыснымі для тых ці іншых сфер грамадскага жыцця, дзяржавы і людзей. Заканадаўчая база ўдасканальваецца ў плане большага напаўнення нормамі прамога дзеяння, канкрэтызацыі прававых палажэнняў, зняцця застарэлых або супярэчлівых нормаў. Сутнасць новых законаў у тым, што яны ствараюць лепшыя ўмовы для сацыяльна-эканамічнага развіцця, умацавання бяспекі і міжнароднага супрацоўніцтва краіны.

— Мінулы год паказаў, што свет пераходзіць у іншую эканамічную, палітычную і глабальную рэальнасць. Як вы мяркуеце, чаго патрабуе ад парламентарыяў цяперашні час?

— Я сказаў бы, што мы ўжо жывём у іншай глабальнай рэальнасці, якая наступіла з надыходам сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу і цяпер паглыбляецца, як у эканоміцы, так і ў палітыцы, што асабліва відавочна ў міжнародных адносінах. Пра гэта можна меркаваць па тым, як вырашаюцца ці не вырашаюцца ключавыя пытанні глабальнага, ды і рэгіянальнага характару. Ідзе жорсткая канкурэнтная барацьба за рэсурсы, рынкі, сферы ўплыву, у якой буйныя гульцы і інтэграцыйныя аб'яднанні імкнуцца атрымаць для сябе найбольшую выгаду. Рэспубліка Беларусь не мае глабальных амбіцый, але ў нас ёсць нацыянальныя інтарэсы, якія дзяржава рухае і адстойвае на міжнароднай арэне, у тым ліку і метадамі парламенцкай дыпламатыі. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб граматна, з карысцю для краіны — гандлёва-эканамічнай і палітычнай — рэагаваць на сучасныя выклікі, унутраныя і знешнія праблемы, з якімі сёння сутыкаецца Беларусь. Менавіта ў такім напрамку ўдасканальваюцца заканадаўчыя механізмы і ўмацоўваюцца нашы міжнародныя сувязі.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Дзяржкантроль Эстоніі прызнаў няздольнасць краіны прымаць бежанцаў

Здольнасць улад Эстоніі прыняць тых, хто хадайнічае пра міжнародную ахову, і інтэграваць іх у грамадства, на думку Дзяржкантроля краіны, мае патрэбу ў істотнай дапрацоўцы. Пра гэта ў аўторак, 19 студзеня, паведаміла выданне Postimees.

На падставе патрабаванняў міграцыйнай праграмы Еўрасаюза Эстонія абавязана прыняць і інтэграваць 550 чалавек, якія атрымалі міжнародную ахову. У ходзе аўдыту высветлілася, што дзяржава гатова да гэтага толькі часткова, а яе інстытуты маюць патрэбу ў дапрацоўцы. Эстонія можа цалкам выканаць тры і часткова 13 абавязацельстваў з 17. Пры гэтым адзначаецца, што не распрацавана сістэма перыядычнага перагляду статусу чалавека, які атрымаў ахову. Разам з тым дзяржава цалкам гатова плаціць уцекачам дапамогу і пенсіі, а органы самакіравання могуць прапаноўваць ім тыя ж паслугі, што і астатнім жыхарам.

У Японіі памёр самы пажылы жыхар планеты

Пра гэта паведамляе агенцтва Kyodo. Ясутара Каідэ памёр у бальніцы горада Нагоя ў аўторак, 19 студзеня. Яму было 112 гадоў.

Каідэ, які нарадзіўся 13 сакавіка 1903 г., быў прызнаны найстарэйшым мужчынам на Зямлі пасля таго, як 7 ліпеня мінулага года таксама ва ўзросце 112 гадоў памёр яго суайчыннік Сакар'я Мамо. 28 верасня 2015-га ў Японіі ва ўзросце 115 гадоў памерла найстарэйшая жыхарка краіны. Па просьбе сям'і доўгажыхаркі ведамства не апублікавала яе імя, паведаміўшы толькі, што яна нарадзілася 15 сакавіка 1900 г. у Токіа. Пасля гэтага самай пажылой жанчынай у Японіі стала 115-гадовая Набі Тадзіма. Найстарэйшым мужчынам Японіі зараз лічыцца 111-гадовы Масаміцу Ёсіда Міноры. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын у Японіі ў 2014 годзе склала 80 гадоў, жанчын — 86. У краіне пражываюць каля 60 тысяч чалавек, якія адзначылі векавы юбілей.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Кінаакадэмія ЗША перагледзіць склад пасля скандалу з расісцкай падаплёкай

Акадэмія кінематаграфічных мастацтваў і навук ЗША, якая традыцыйна прысуджае прэміі «Оскар», распачне крокі па змене складу яе членаў, заявіла прэзідэнт установы Шэрыл Бун Айзекс. Падставай для гэтага стаў скандал вакол вылучэння на прэмію «Оскар», калі кінаакадэміі ўказалі на тое, што сярод намінантаў-акцёраў толькі белыя.

Айзекс нагадала, што адпаведныя змены пачалі адбывацца ў апошнія чатыры гады, аднак яны не ідуць так хутка, як хацелася б. У 2016 годзе дзеля дасягнення разнастайнасці будуць звяртаць увагу на такія рысы, як пол, раса, этнічная прыналежнасць і сексуальная арыентацыя. Раней, у прыватнасці, кінарэжысёр і акцёр Спайк Лі заявіў, што мае намер байкатаваць цырымонію ўручэння кінапрэмій «Оскар», бо сярод намінантаў у акцёрскіх катэгорыях адсутнічаюць чарнаскурыя. Сваё глыбокае расчараванне выказала і чарнаскурая актрыса Джада Пінкет-Сміт: «На «Оскары» каляровыя часта забаўляюць публіку і раздаюць узнагароды, але нашы акцёрскія дасягненні рэдка прызнаюцца». Намінанты на «Оскар» былі абвешчаныя 14 студзеня. У пяці асноўных катэгорыях — «Лепшая рэжысёрская праца», «Лепшая мужчынская роля», «Лепшая жаночая роля», «Лепшая мужчынская роля другога плана» і «Лепшая жаночая роля другога плана» — няма ні аднаго чарнаскурага намінанта. Вядучым цырымоніі кінапрэміі прызначаны чарнаскуры комік Крыс Рок.

КОРАТКА

Беларускія дзяржслужачыя з 2016 года абавязаны прадастаўляць больш поўную інфармацыю пры запаўненні дэкларацый аб даходах.

У Беларусі 25,1 працэнта атрымальнікаў пенсій працягваюць працаваць — фактычна кожны чацвёрты пенсіянер. Працягваюць працоўную дзейнасць 651,2 тыс. пенсіянераў. Прычым прадстаўніц прыгожага полу сярод працуючых пенсіянераў у два разы больш, чым прадстаўнікоў моцнай палавіны (438,4 тыс. жанчын і 212,8 тыс. мужчын).

Базавая школьная праграма павінна быць скарочана мінімум на 20—30 працэнтаў, заявіў міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў.

Вікторыя Азаранка выйшла ў другі раўнд Australian Open — 2016. У стартавым паядынку яна абыграла бельгійскую тэнісістку Элісан Ван — 6:0, 6:0.

Спецыялізаваны рыбны кірмаш пройдзе каля Мінскага лядовага Палаца спорту 23—24 студзеня з 9.00 да 16.00.

■ Удалы старт

«УХАПІЛІСЯ» ЗА РЫНАК

Беларускія машынабудаўнікі пачынаюць год плённа. Буйныя айчынныя кампаніі плануюць стварэнне сумесных прадпрыемстваў з удзелам замежнага капіталу, будаўніцтва сэрвісных цэнтраў, павелічэнне імпартных паставак на перспектыўныя рынкі.

Сэрвісныя цэнтры ў Індыю, а машыны ў В'етнам

Ужо сёлета ў лютым БелАЗ плануе адкрыць сэрвісны цэнтр у Індыі. Падпісана трохбаковае пагадненне з кампаніямі Belaz Enrika Mining Equipment and Services Private limited і Voltas Ltd. (Індыя) аб доўгатэрміновым глабальным сэрвісным абслугоўванні тэхнікі БелАЗ і гарантыях паставак кар'ернай тэхнікі. Акрамя таго, завяршаецца будаўніцтва сэрвіснага цэнтра прадпрыемства ў Індыі (Нагпур), афіцыйнае адкрыццё якога запланавана на люты. Сёлета прадпрыемствы Мінпрама працягнуць працу па актывізацыі супрацоўніцтва з ключавымі краінамі «далёкай дугі», а таксама па выхадзе на новыя перспектыўныя рынкі Афрыкі, Амерыкі, Азіі і Блізкага Усходу. У В'етнаме ўжо запрацавалі першыя самазвалы БелАЗ грузападымальнасцю 90 тон. Яны былі сабраныя метадам буйнавузлавой зборкі в'етнамскай карпарацыяй «Вінакамін» сумесна са спецыялістамі Беларускага аўтамабільнага завода і з'яўляюцца першымі айчыннымі аўтамабілямі такой грузападымальнасці ў гэтай азіяцкай краіне. В'етнамскі бок на працягу двух месяцаў будзе праводзіць выпрабаванні самазвалаў у кар'еры і навучаць свой персанал, пасля чаго чакаецца рашэнне в'етнамскага боку аб набыцці да 100 адзінак тэхнікі. Прадстаўнікі карпарацыі «Вінакамін» адзначылі, што аўтамабілі БелАЗ маюць шэраг пераваг перад канкурэнтамі.

СТАР. 2